# УПЛЫЎ ХРЫСЦІЯНСТВА НА ШЛЮБНА-СЯМЕЙНАЕ ПРАВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

В. С. Прохарава

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, к.гіст.н, дацэнт

Асаблівае месца ў гісторыі ўсходніх славян, у тым ліку і продкаў беларусаў, займае перыяд раннефеадальнай дзяржаўнасці, звязаны з існаваннем Кіеўскай Русі (X–XIII стст.). У гэты час адбылося станаўленне дзяржаўнасці і прыняцце хрысціянства, што ў сваю чаргу ўнесла змены ў сямейны побыт усходнеславянскіх народаў. Звесткі аб сямейным укладзе народаў, насяляўшых тэрыторыю Кіеўскай Русі да прыняцця хрысціянства, вельмі нямножныя і нязначныя. Крыніцы сведчаць аб тым, што ў гэты перыяд сямейныя адносіны рэгуляваліся звычаёвым правам.

У працэсе даследавання пераходнага часу ад паганства да хрысціянства вучоныя ў большай ступені гавораць толькі аб перыядах паганства і хрысціянства, у той жа час пераход ад адной эпохі да другой вельмі значна адбіўся на шлюбна-сямейных адносінах і быў вельмі цяжкі і доўгі для ўсходнеславянскіх народаў.

Такім чынам, карыстаючыся канцэпцыяй савецкага гісторыка Ігара Фраянава, А. В. Іншакоў выдзяляе тры перыяды ў эвалюцыі шлюбна-сямейнага права ў названы прамежак часу: паганскі (звычаёвы), пераходны (кроўна-дагаворны), хрысціянскі (царкоўна-дагаварны) [1].

Да прыняцця хрысціянства на землях Кіеўскай Русі існавала некалькі спосабаў заключэння шлюбу: крадзеж нявесты, купля-продаж і дагаворны шлюб.

*Крадзеж*, або “умычка” нявесты была самым старым спосабам заключэння шлюбу. Яна першапачаткова насіла гвалтоўны характар і адбывалася без згоды нявесты, а потым гэты абрад здзяйсняўся па дамоўленасці нявесты і жаніха. Такі абрад сустракаецца ў радзімічаў, вяцічаў і севяран. Рабілася гэта, хутчэй за ўсе, ў гонар багіні шлюбу – Лады. У драўлян крадзеж нявест адбываўся “ў вады” (ён меў вялікае абрадавае значэнне пры заключэнні шлюбаў, і нават пасля прыняцця хрысціянства вясельныя абрады “ў вады” яшчэ доўга замянялі царкоўнае вянчанне) [2, с. 22].

Але умычка нявест прыводзіла да ўзнікнення варожасці паміж родамі, таму каб папярэдзіць кровапраліцце, абражаны род патрабаваў узнагароду ад выкрадальніка. З часам такія выплаты ператварыліся ў прамы продаж нявесты жаніху [3, с. 27]. Варта адзначыць, што такім чынам нявеста па сутнасці станавілася ўласнасцю жаніха. Ён меў правы на ўсе маёмасці сваёй жонкі (адзенне, упрыгожванні і свабоду ў тым ліку).

Потым большае распаўсюджванне атрымала прывядзенне нявесты ў хату жаніха. Рабілася гэта бацькамі нявесты праз прынясенне пасагу разам з ёю. У такой форме шлюбу як жаніх, так і нявеста мелі аднолькавыя правы на маёмасці

нявесты і пасаг. Такім чынам, продаж нявесты адбываўся па дамоўленасці паміж бацькамі жаніха і нявесты. Гэты спосаб заключэння шлюбу існаваў у палян. І, насамрэч, гэта вельмі добра ўмацоўвала становішча дзяўчыны ў шлюбе.

Існавала працэдура заключэння шлюбу, якая падзялялася на тры этапы: падрыхтоўчы этап, вянчанне і вяселле [4, с. 101]. Падрыхтоўчы этап, у сваю чаргу, таксама падзяляўся на некаторыя этапы, якія складалі вызначаны парадак. Спачатку праводзіліся "Запоіны" (малыя і вялікія). Малыя запоіны ўяўлялі сабой сватанне жаніха і нявесты, агляд бацькамі будучых сваякоў. На вялікіх запоінах бацькі здзяйснялі абрад змовін аб тэрмінах, умовах, парадку вяселля. Пры змовінах бацькамі падпісваўся змоўны ліст, які меў сваю юрыдычную сілу і афармляўся ў асаблівым парадку, а потым перадаваўся для ўнясення ў актавыя кнігі судоў. А таксама ў падрыхтоўчы перыяд праводзіліся заручыны, на якіх маладыя абменьваліся пярсцёнкамі ў знак згоды бацькоў на пераход нявесты пад уладу яе мужа.

З прыняццем хрысціянства выдзеліўся асобны этап – вянчанне [4, с. 102]. З цырымоніяй вянчання спалучаліся некаторыя паганскія абрады, якія павінны былі садзейнічаць багаццю і ўрадлівасці новай сям'і.

Апошнім, трэцім этапам заключэння шлюбу з'яўлялася ўласна вяселле. Яно пачыналася замешваннем і выпяканнем цеста для каравая. Потым пір пачынўся спачатку ў нявесты і працягваўся ў жаніха. Асноўным абрадам на вяселлі было "злучэнне маладых". Рабілася яно для аб'яднання маладых на доўгі век. Пасля злучэння нявеста станавілася жонкай. Апошнім абрадам на вяселлі былі пярэзы – апошняя вясельная размова [4, с. 102].

Наступным этапам станаўлення шлюбна-сямейнага права ва ўсходніх славян стала заканадаўчае афармленне гэтага права ў крыніцах права. Адной з такіх крыніц, якая рэгулявала прававыя, ў тым ліку і шлюбна-сямейныя адносіны ў X ст., з'яўляецца Руска-Візантыйскі дагавор, які дайшоў да нас ў выкладзе Аповесці мінулых гадоў XII ст. Пазней прававое становішча сям'і адлюстравалася ў Рускай Праўдзе, у якую былі ўключаны звесткі аб складзе сям'і, прававым становішчы жанчын, маёмасных адносінах мужа і жонкі, сістэме атрымання ў спадчыну, маёмасным становішчы дачок і ўдоў у сям'і. Большая ўвага ў дакуменце ўдзелена інстытуту апекі: прычынам і працэдуры яе афармлення і спынення, а таксама правам і абавязкам апекуноў [3, с. 28].

Але існуе і такі момант, што пасля заканадаўчага афармлення шлюбна-сямейнага права, ўсё роўна існавала палігамія, але ж яна не была даступнай для ўсіх [5, с. 37]. Такую магчымасць меў ў большай ступені князь. Напрыклад, добра вядома пра гарэм князя Уладзіміра Святаславіча. Прынамсі, князь Уладзімір меў як мінімум шэсць законных жонак. Такім чынам князь узвышаў свой статус. Лічылася, што цнатлівы мужчына не мог быць сапраўдным гаспадаром. Палігамія была сімвалам яго сілы, харызмы і багацця.

Пераходны перыяд ад паганства да хрысціянства ў шлюбна-сямейным праве можна прасачыць на прыкладзе малой і вялікай сямей і пераходных форм паміж імі. Малая сям'я, якая складалася з бацькоў і іх дзяцей, якія яшчэ не ўступілі ў шлюб, жыла ў асобнай невялічкай хаце, мела сваю гаспадарку і была

першапачатковым вытворчым калектывам [1]. Разам з ёю існавала і вялікая сям'я, або "род", які складаўся з 3–5 пакаленняў па прамой і бакавой лініях.

Малая сям'я паступова адасобілася ад рода. Узнікненне яе было абумоўлена большай вытворчасцю працы і дастатковай рэнтабельнасцю невялікай гаспадаркі. Але малая сям'я была менш стойкай ў барацьбе з сіламі прыроды, ў сацыяльных спрэчках з заможнымі сялянамі і моцнымі сем'ямі, а таксама з уладай феадальнай дзяржавы, абкладаючай насельніцтва данінаю, судовымі штрафамі і пошлінамі [1].

Роля рода паступова змянялася роляй малой сям'і. Род не меў вялікага рацыянальнага сэнсу ў працэсе пераходу да хрысціянства. Але вялікія сем'і, згубіўшы гаспадарчы характар, усё роўна выконвалі некаторыя рэгулятыўныя функцыі. Яны абаранялі родавыя сувязі, падтрымлівалі правы і абавязкі сваякоў і суседзяў, сувязь пакаленняў, і абаранялі свае культурныя традыцыі. З аслабленнем вялікіх сямей і ўзмацненнем малых прыходзіла больш рацыянальная форма ўзнаўлення пакуль яшчэ слабой ячэйкі грамадства. Яна была заснавана на прынцыпах устойлівасці і захавання членаў малой сям'і, што адпавядала эканамічным і палітычным інтарэсам не толькі сям'і, але і дзяржавы [1].

Абапіраючыся на тэксты Рускай Праўды, можна казаць, што канчатковы распад кроўна-роднасных сувязяў прыходзіцца на канец Х–пачатак ХІ ст. Вялікая сям'я канчаткова выцяснялася малой манагамнай сям'ёй, што было новай з'явай для дадзенага перыяду. Дзяржава абавязвалася абараняць малую сям'ю, якая спрыяе хатняй і таварнай гаспадарцы, што безумоўна адпавядае інтарэсам дзяржавы. Таму яна абавязана забяспечыць усе неабходныя ўмовы для ўмацавання і захавання малой сям'і [1].

Апошнім перыядам ў працэсе пераходу шлюбна-сямейнага права ад паганства да хрысціянства з'яўляецца царкоўна-дагаворны перыяд, калі шлюбна-сямейнае права атрымала больш поўнае прававое замацаванне ў пісаных крыніцах. Шлюб стаў рэгулявацца Номаканонам – зборнікам візантыйскага сямейнага права, складзенага з кананічных правіл і свецкіх пастановаў візантыйскіх імператараў. У перакладзе на царкоўнаславянскую мову ён атрымаў назву "Кормчая кніга". Асновай таксама можна назваць нормы з Эклогі і Прахірона, што былі запазычаны ў Візантыі і таксама адлюстраваліся ў праве Кіеўскай Русі. Пазней і Кормчыя кнігі, і запазычаныя нормы з рымскага права сталі дапаўняцца князкім заканадаўствам. Таксама мела свой уплыў Святое Пісанне [3, с. 29].

Асаблівай рысай дадзенага перыяда з'яўляецца тое, што абраднасць і традыцыйнасць, якая адыгрывала вялікую ролю да прыняцца хрысціянства, ўсё роўна мела месца і пад час хрысціянізацыі, але не мела абавязковага характару. Нормы паганства захаваліся, але ў зменённай форме і ў другой назве. Напрыклад, крадзеж нявесты "ў вады" ператварыўся з прыняццем хрысціянства ў вянчанне, што стала неабходнай ўмовай заключэння шлюбу.

Для заключэння шлюбу ў хрысціянскі перыяд трэба было выканаць неабходныя ўмовы, а таксама царква выдзяліла свае этапы працэсу злучэння ў

шлюб: заручыны, складанне пісьмовага кантракту – змоўнага ліста, прыняцце блаславення ў храме і вянчанне [4, с. 104].

З прыняццем хрысціянства галоўным момантам злучэння ў шлюб была узаемная згода жаніха і нявесты. А згода бацькоў з'яўлялася галоўнай умовай сапраўднасці шлюбу. На сапраўднасць шлюбу таксама ўплывалі:

- узрост: старажытнарускім праве вызначаўся мінімальны ўзрост уступлення ў шлюб для мужчын і жанчын – 15 і 12 год адпаведна;
- адсутнасць блізкіх ступеняў радства і сваяцтва: гэта было забаронена біблейскім канонам;
- адзінае веравызнанне: забаранялася ўступаць у шлюб з чалавекам нехрысціянскага веравызнання;
- манагамія: хрысціянства забараняла ўступаць у шлюб з другой дзяўчынай, калі жаніх ужо меў жонку;
- забаранялася ўступаць у шлюб больш 3-х разоў, што лічылася абражаннем для рода мужчыны [1; 4, с. 104–107].

Такім чынам, да прыняцця хрысціянства ў Кіеўскай Русі сямейнае права рэгулявалася звычаёвым правам. Беларускія землі ў гэты час мелі прыкладна тыя ж тэндэнцыі дзяржаўна-прававога развіцця, што і іншыя княствы Кіеўскай Русі, таму тэндэнцыі развіцця шлюбна-сямейнага права, яго крыніцы тут таксама аднолькавыя. Варта адзначыць, што вясельныя абрады і традыцыі з'яўляліся не толькі абавязковымі, але і юрыдычна пацвярджалі сапраўднасць шлюбу. Хоць шлюбна-сямейнае права абапіралася ў перыяд паганства на няпісаныя крыніцы, яно ўсё роўна было на даволі высокім узроўні. Гэта таксама пацвярджаецца тым, што абрады і традыцыі былі абавязковымі. Сям'я ў перыяд паганства была палігамнай, яе функцыяй было ўзнаўленне рода, выхаванне патомства і вядзенне сумеснай гаспадаркі. Становішча жонкі ў такой сям'і было падпарадкаваным: яна поўнасцю знаходзілася пад уладай мужа. Але пасля прыняцця хрысціянства, ў перыяд станаўлення дагаворнага шлюбу, становішча жонкі стала лепшым. Жанчына мела такія ж самыя правы на свае рэчы, як і яе муж. З'явіліся новыя ўмовы ўступлення ў шлюб, што таксама палепшыла становішча дзяўчыны ў шлюбе. Адбыўся пераход ад палігамнай да манагамнай сям'і. У перыяд хрысціянства шлюбна-сямейнае права стала рэгулявацца пісанымі крыніцамі не толькі царкоўнага, але і свецкага характару.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Иншаков, О. В. Отражение эволюции института семьи в Русской Правде [Электронный ресурс] / О. В. Иншаков. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/otrazhenie-evolyutsii-instituta-semi-v-russkoy-pravde. – Дата доступа : 07.10.2023.

2. Присяжнюк, А. И. Становление семейно-брачных отношений в условиях взаимодействия и противоречия язычества и христианства в Древней Руси / А. И. Присяжнюк // Закон. Право. Государство. – 2016. – № 2(10). – С. 22–27.

3. Дмитриев, А. С. Древнерусские брачно-семейные отношения и их регулирование / А. С. Дмитриев // Вестник Санкт-Петербургской юридической академии. – 2011. – № 2(11). – С. 26–29.
4. Дзербіна, Г. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу / Г. Дзербіна. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 175 с.
5. Жиляева, С. К. К вопросу о заключении брака в языческой Руси / С. К. Жиляева, А. А. Максимова // Вестник Уральского института экономики, управления и права. – 2021. – № 4(57). – С. 36–41